Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

УКАРАНЯЕМ РУЖЫ З ДАПАМОГАЙ НАТУРАЛЬНЫХ УГНАЕННЯЎ

Калі ў вас у вазе стаіць букет руж, якія вы б хацелі бачыць на сваім участку, не спяшайцеся выкідваць кветкі адразу пасля таго, як яны пачалі вянуць. Паспрабуйце ўкараніць ружы.

З дапамогай вострага нажа зрэжце ў ружы верхнюю частку такім чынам, каб застаўся чаранок памерам прыкладна 25 см. Пакрыйце воскам яго верхні зрэз. Для таго каб абнавіць чаранок, выдаліце з яго ўсё лісце і крыху абрэжце ніжні зрэз.

Пасля гэтага чаранкі трэба апрацаваць адным з ніжэйапісаных спосабаў. Можна паспрабаваць усе тры. Такім чынам вы зможаце вызначыць, які з іх падыходзіць для вас больш.

Першы спосаб

Прыгатуйце дражджавы раствор (100 мг дрожджаў на 10 літраў вады). Змясціце ў яго чаранкі прыкладна на адну траціну на 24 гадзіны. Па заканчэнні гэтага часу прамыйце іх цёплай вадой і пастаўце ў ёмістасць з вадой такім чынам, каб яна даходзіла да паловы чаранка. Па меры ўкаранення рэгулярна падлівайце ваду, каб яе ўзровень заўсёды захоўваўся на адной вышыні.

Другі спосаб

У літры вады трэба растварыць чайную лыжку мёду. У мядовы раствор змясціце чаранкі на адну траціну і пакіньце іх там на 12 гадзін. Пасля гэтага дастаньце і пастаўце іх у ёмістасць з вадой, каб чаранкі былі ў ёй напалову.

Трэці спосаб

У ваду з чаранкамі дадайце 10 кропель соку алоэ (абавязкова свежага). Алоэ стымулюе з'яўленне карэньчыкаў і ў той жа час імунную сістэму чаранка. Вада павінна даходзіць да сярэдзіны чаранкоў. Рэгулярна падлівайце яе, каб узровень не зніжаўся. Праз 10 дзён можаце дадаць яшчэ 5-7 кропель соку алоэ.

Пасля таго як ружа пусціць досыць буйныя карані, выконваючы ўсе правілы пасадкі расліны, высадзіце чаранкі ў падрыхтаваную для гэтай мэты ёмістасць з кветкавым грунтам.

ПАДКОРМКА ДЛЯ ПАКАЁВЫХ КВЕТАК

Калі кветка цвіце адзін раз у год, то і падкарміць яе трэба будзе ўсяго адзін раз.

Калі ж расліна цвіце пастаянна або некалькі месяцаў у годзе, то трэба будзе падкормліваць адзін раз у месяц у перыяд, калі спеюць бутоны.

Расліну трэба падкарміць унясеннем у глебу рыцыны.

Робім гэта так: спачатку адстойваем ваду прыкладна пару гадзін, потым на 1 літр вады дадаём 1 ч. л. рыцыны. Добра ўсё гэта ўзбоўтваем. Алей разаб'ецца на маленькія шарыкі. Падтрасайце далей, каб ён размеркаваўся ў вадзе раўнамерна, і адразу палівайце расліну, пакуль алей не падняўся на паверхню вады, інакш у канцэнтраваным выглядзе ён можа нашкодзіць караням расліны.

Вось і ўся хітрасць!

Даты Падзеі Людзі

7 САКАВІКА

У краіне

1912 год — нарадзіўся (в. Шайтарава, цяпер у Верхнядзвінскім раёне) Тарас Канстанцінавіч Хадкевіч, беларускі пісьменнік, заслужаны работнік культуры Беларусі. Аўтар раманаў «Даль палявая», «Песня Дзвіны», зборнікаў апавяданняў «Дружба», «Сад у квецені» і інш. Адзін з аўтараў кнігі «Мы раскажам пра Мінск». Памёр у 1975 годзе.

1918 год — нарадзіўся (в. Чарэя, цяпер у Чашніцкім раёне Віцебскай вобласці) Яўген Піліпавіч Іваноўскі, савецкі ваеначальнік, генерал арміі, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года — на Заходнім, Сталінградскім, Варонежскім, 1-м і 2-м Беларускіх франтах. Удзельнік баёў пад Масквой, Сталінградам, Курскам, вызвалення Украіны, Польшчы, Усходне-Прускай аперацыі. У 1945—1956 гадах — на адказных пасадах у Савецкай Арміі. З 1980 года — камандуючы войскамі БВА, з 1985-га — галоўнакамандуючы сухапутнымі войскамі — намеснік міністра абароны СССР, з 1989 года — ваенны інспектар-саветнік. Памёр у 1991 годзе.

1922 год — нарадзіўся (в. Слабадшчына Мінскага раёна) Вітольд Міхайлавіч Гінтаўт, Герой Савецкага Саюза (1944). У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік баёў на Калінінскім напрамку, пад Ржэвам, Курскай бітвы, вызвалення Украіны, Польшчы, Румыніі, баёў у Германіі. Вызначыўся ў баі пад Вінніцай (Украіна): знішчыў шэсць варожых танкаў, самаходную гармату. Памёр у 1987 годзе.

1953 год — нарадзіўся (г. Драгічын) Уладзімір Уладзіміравіч Кожух, беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. Лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі за серыю работ «Чарнобыля чорная быль». Працаваў у станковым жывапісе. Аўтар цыкла «Чарнобыльскі альбом», карцін «Купалле», «Светлыя дні восені» і інш. Работы мастака захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь, а таксама ў прыватных калекцыях Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. Памёр у 2017 годзе.

Па свеце

1657 год — французскі кароль Людовік XIV забараніў продаж спіртнога індзейцам Амерыкі.

1876 год — дзень нараджэння тэлефона: Аляксандр Бэл запатэнтаваў вынайдзены ім тэлефонны апарат. Хоць ідэя тэлефанавання была распрацавана яшчэ ў сярэдзіне XIX стагоддзя французскім інжынерам-механікам Шарлем Бурселем, але да практычнага ажыццяўлення тэлефоннай сувязі ён не дайшоў. Дарэчы, лічыцца, што менавіта Бурсель стаў першым, хто ўжыў слова «тэлефон». Бэл жа, працуючы над стварэннем тэлеграфа, выявіў, што пры ўзнікненні электрычнага сігналу ў тэлеграфным апараце з'яўляліся гукі. Гэта і навяло яго на думку аб стварэнні дыстанцыйнай перамоўнай прылады. У выніку ён здолеў пераўтварыць гукавы сігнал (мову) у аналагавы электрычны, а затым перадаваць яго на пэўную адлегласць і зноў ператвараць у гукавы, а таксама стварыў і першае прыстасаванне, якое складалася з невялікай мембраны і сігнальнага ражка для ўзмацнення гуку і ўяўляла сабой трубку, дзе адначасова знаходзіліся і перадатчык, і прыёмнік.

1878 год — нарадзіўся Барыс Міхайлавіч Кустодзіеў (1878—1927), рускі жывапісец, графік і тэатральны мастак, акадэмік Пецярбургскай акадэміі мастацтваў. Ён падарыў нам настальгічны свет, сонечны і радасны, які падкрэслівае яркімі фарбамі адчуванне свята.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	7.44	18.58	11.14
Віцебск —	7.35	18.46	11.11
Магілёў —	7.35	18.48	11.13
Гомель —	7.30	18.46	11.16
Гродна —	7.59	19.14	11.15
Брэст —	7.58	19.15	11.17

Месяц

Поўня 2 сакавіка.
Месяц у сузор'і Скарпіёна.

Імяніны

Пр. *Ірыны, Апанаса, Віктара, Івана, Іосіфа, Леаніда, Міхаіла, Пятра, Уладзіміра, Фёдара.*
К. *Феліцыты, Паўла, Тамаша.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Дарагі, на 8 Сакавіка я хачу новыя боцікі да майго норкавага футра.

— Але ж у цябе няма норкавага футра!

— Во-о-ось!

Напярэдадні 8 Сакавіка па шматлікіх просьбах мужчын у продаж паступілі шампунь «Просты», ласьён «Звычайны», памада «Чорт ведае якая» і духі «Дык любыя ўжо».

— Дарагі, не купляй мне пярсцёнак на 8 Сакавіка.

— Што з машынай?..

6 сакавіка з рэанімацыі пасля цяжкай аперацыі знікла хворая.

Як высветлілася, гэта гаспадыня кветкавага кіёска папаўзла на працу...

— Дарагая, што табе падарыць на 8 Сакавіка? Выбірай што хочаш — брыльянтавае калье, норкавае футра, вілу на Французскай Рыўеры?..

— Мілы, падары мне толькі сённяшні вечар і сваё каханне.

— Знята! — абвясціў рэжысёр.

З Міжнародным жаночым днём, са святам вясны шчыра віншуем нашу першую каляжанку інастаўніцу **Любоў Кліменцьеўну ВЯРБІЦКУЮ з вёскі Гута Ганцавіцкага раёна!** Зычым добрага здароўя, бадзёрасці і ўсмешак.

З павагай і ўдзячнасцю А. Шахрай, У. Кендыш, А. Свірыд, А. Жукоўскі і Т. Новік.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 882. Нумар падпісаны ў 19.30 6 сакавіка 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12